# Глава II. АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ БЕЛАРУСІ

## 2.1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель (1772–1796 гг.)

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова)*

25 ліпеня 1772 г. у Пецярбургу былі падпісаны трактаты паміж Расіяй, Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй адносна першага падзелу Рэчы Паспалітай. Да Аўстрыі адышлі поўдзень Польшчы і Заходняя Украіна, Прусія акупіравала польскае Памор'е. У гэтых трактатах вызначалася тэрыторыя, якая адыходзіла да Расійскай імперыі. Яна пачыналася ад польскай Ліфляндыі па правым беразе р. Дзвіна, якая стала граніцай паміж дзвюма дзяржавамі. Далей падзел праходзіў да пункта злучэння трох ваяводстваў (Полацкага, Віцебскага і Мінскага), а ад яго – па прамой лініі да вытокаў р. Друць каля мястэчка Талачын, а затым – па цячэнні гэтай ракі да ўпадзення ў р. Днепр каля г. Рагачова. На ўсходзе Днепр да яго прытока р. Сож з'явіўся натуральнай мяжой паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай[1].

Па першым падзеле Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі адышла тэррыторыя плошчай 93 тыс. км$^2$, на якой жылі 1 млн 225 тыс. чал.[2] У сакавіку – снежні 1773 г. спецыяльная экспедыцыя Расійскай Акадэміі навук начале з І. Ляпёхіным вызначыла геаграфічныя каардынаты мясцовасці, што служыла падставай для яе дакладнага картаграфавання. Але згаданыя мерапрыемствы не закранулі размеркавання тэрыторыі паміж вызначанымі адміністрацыйнымі адзінкамі[3]. У выніку далучаныя тэрыторыі, што раней уваходзілі ў склад Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага і часткі Мінскага ваяводстваў, увайшлі ў склад дзвюх губерняў: Пскоў-

---

[1] Мартенс, Ф. Ф. Собрание трактатов и конвенций, заключенных Россиею и иностранными державами / сост. Ф. Мартенс. – СПб. : Тип-я Министерства путей сообщения (А. Бенке), 1874–1909. – Т. 2: 1772–1808. – 1875. – XVI, 517 с.– С. 26–29; ПСЗРИ. Собр. 1-е. – Т. 19 (1770–1774).– № 13850. – С. 553–559.

[2] Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – С. 444. – Т. 1.

[3] Зенчанка, С. Усталяванне расійскай сістэмы кіравання / С. Зенчанка // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці у канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш] ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш] ; Нац. акад. навук Беларусі, ін-т. – Мінск : Беларус. навука, гісторыі 2011. – Кн. 1. – С. 62.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ